

# ШАСТАК
## Ядвіга Віктараўна

Нарадзілася ў 1939 годзе ў вёсцы Марцінавічы Зэльвенскага раёна.

Працоўны шлях пачала 15-гадовай дзяўчынкай пасля заканчэння пачатковай школы. Працягнула вучобу ў Крамяніцкай вячэрняй школе, дзе і закончыла 8 класаў.

Амаль два гады Ядвіга Віктараўна працавала свінаркай на ферме Лебядзі, а з 1956 года даяркай на малочна-таварнай ферме ў Лебядзях.

За час працы зарэкамендавала сябе вопытнай і добрасумленнай работніцай.

За праяўленую працоўную доблесць Ядвіга Віктараўна ўзнагароджана Ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1975), медалём “За працоўную доблесць”, знакам “Ударнік XI пяцігодкі” (1985).

Пастановай праўлення калгаса, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 06 лютага 1989 г. за вялікія заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці Шастак Я.В. занесена ў Кнігу Працоўнай Славы калгаса.